гі. Вось, напрыклад, аўтаручка Уладзіміра Караткевіча. Яе прыслаў у музей А. Мальдзіс. А чаму менавіта для нас яна дарагая? Уладзімір Караткевіч пісаў ёю свой раман «Каласы пад сярпом тваім»—пра паўстанне 1863 года.

Экспанаты, экспанаты... Вось шафа. На першы погляд—звычайная. А прыглядзіцца... яна цікавая тым, што ўгары на ёй у промнях узыходзячага сонца пяцікутная зорка. Шафа зроблена ў 1932 годзе, і рабіў яе паэт Міхась Явар. А ў той час за такую шафу майстра маглі б жорстка пакараць.

Невялікая вярцішка, ці, як яе называюць, макотра. Купіў яе Мікалай па прозвішчу Саўка ў Луні недзе перад вайной. У музей гэтую вярцішку здала яго маці Васіліса Саўка, якой цяпер 93 гады. Прасіла: «Каб жа яе зберагл і, бо вярцішку купляў мой Коля. А ён жа загінуў на фронце. Гэта па ім адзіная памяць».

Кадоўб—з аднаго кавалка дрэва. Ніхто цяпер з бондараў не бярэцца ўставіць у яго дно. Не ведаюць, як.

— Калі памірае чалавек,—працягвае Алесь Мікалаевіч,—з ім гінуць многія словы.—І паказвае на круглы гэблік.—Мы ведалі, для чаго ён—габляваць усярэдзіне абады. А можна і кадоўбец усярэдзіне пагабляваць. А як ён па-сапраўднаму называецца, ніхто не ведаў. Два гады шукалі, як называецца. І знайшлі. Ажно ў суседнім раёне. Ярунок. Так слова вярнулася да жыцця.

Вырабы з саломы і лазы. Бочачкі з накрыўкай. Усё ў іх вытрымана ў прапорцыях. Такімі экспанатамі мог бы ганарыцца не адзін музей свету.

Шырока прадстаўлена тут і сучасная беларуская літаратура, партрэты вядомых літаратараў, іх кнігі з аўтографамі.

Гаворка пра жыццё краю, пачынаючы з XV стагоддзя, нарэшце набывае сваё лагічнае завяршэнне. Наведвальнікі, пазнаёміўшыся з літаратурна-краязнаўчым музеем, накіроўваюцца ў этнаграфічны, са знешнім выглядам якога знаёмы многія—Міністэрства сувязі СССР выпусціла нядаўна паштовы канверт са здымкам хаты.

**П. МІКАЛАЕЎ.**

# ІМЁНЫ ВУЧОНЫХ

Як каштоўную рэліквію захоўвае народ памяць аб людзях, якія ўнеслі важкі ўклад у сацыяльны і культурны прагрэс. Сярод іх і вядомыя прадстаўнікі беларускай савецкай навукі. Ім узведзены скульптурныя помнікі, мануманты, абеліскі, устаноўлены мемарыяльныя дошкі...



П. У. Броўка.

Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, народны паэт Беларусі, акадэмік Акадэміі навук БССР **П. У. Броўка** (1905—1980) у сваіх творах уславіў працоўныя і ратныя подзвігі савецкага народа, яго высокі патрыятызм, вернасць ленінскім запаветам, Камуністычнай партыі, барацьбу за мір. Пётр Усцінавіч выступаў з артыкуламі па пытаннях тэорыі літаратуры і мастацтва, вядомы як перакладчык на беларускую мову многіх паэтычных твораў. Народны паэт узначаліў калектыў БелСЭ і шмат зрабіў па падрыхтоўцы і выпуску гэтага першага ў гісторыі Беларусі унікальнага 12-томнага выдання. П. У. Броўка быў сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў СССР, старшынёй Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры, дэпутатам Вярхоўных Саветаў СССР і БССР, членам ЦК КПБ.



С. М. Вышалескі.

Яго заслугі ўвекавечаны шэрагам аб'ектаў. У доме № 30 па вуліцы К. Маркса ў Мінску створаны літаратурны музей паэта. На доме, дзе ён жыў, і ў в. Пуцілкавічы ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі. У Велікадолецкай сярэдняй школе адкрыты мемарыяльны пакой, а ў Пуцілкавічах хата-музей. Імя паэта прысвоена БелСЭ, калгасу «Новае жыццё», Велікадолецкай СШ Ушацкага раёна Віцебскай вобласці, вуліцам у Мінску, Віцебску, Полацку, г. п. Ушачы. Для студэнтаў філфака БДУ імя У. І. Леніна ўстаноўлена стыпендыя імя Петруся Броўкі.

П. Ф. Глебка.



Заснавальнік айчыннай эпізаатало гіі **С. М. Вышалескі** (1874—1958) нарадзіўся на станцыі Обаль Шумілінскага раёна на Віцебшчыне. У 1928—1930 гг. працаваў загадчыкам кафедры эпізааталогіі Віцебскага ветэры-



М. І. Грашчанкаў.



М. В. Дарашэвіч.



У. А. Кароль.

нарнага інстытута і адначасова дырэктарам Беларускага дзяржаўнага ветэрынарна-бактэрыялагічнага інстытута ў Віцебску. Адзін з першых правадзейных членаў Акадэміі навук БССР.

Вучоны шырокага профілю — мікрабіёлаг, імунолаг, паталагаанатам — С. М. Вышалескі распрацаваў метады барацьбы з сібірскай язвай, чумой і рожай свіней, туберкулёзам і бруцэлёзам. У гонар вучонага выпушчаны залаты медаль яго імя, які прысуджаецца УАСГНІЛ раз у тры гады за выдатныя навуковыя работы і адкрыцці ў галіне эпізааталогіі, устаноўлена стыпендыя для студэнтаў Віцебскага ветінстытута. Яго імя прысвоена Беларускаму НДІ эксперыментальнай ветэрынарыі і Архангельскай абласной ветлабараторыі. На будынку Усесаюзнага інстытута эксперыментальнай ветэрынарыі ў Маскве ў памяць аб акадэміку АН БССР С. М. Вышалескім устаноўлена мемарыяльная дошка.

Вядомы беларускі паэт, грамадскі дзеяч, акадэмік АН БССР П. **Ф. Глебка** (1905—1969) шмат зрабіў у літаратуры, мастацтвазнаўстве. Здольнасці арганізатара асабліва праявіліся на пасадзе дырэктара ІМЭФ Акадэміі навук БССР, а з 1969 г. — акадэміка-сакратара Аддзялення грамадскіх навук АН БССР.

Вершы паэта ўслаўляюць гераічныя падзеі Кастрычніка, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, гарачы патрыятызм савецкіх людзей, іх самаадданую працу ў пасляваенны перыяд. Імя П. Ф. Глебкі прысвоена Літвянскай сярэдняй школе Уздзенскага раёна і вуліцы ў Мінску. На доме № 36 па вуліцы К. Маркса ў беларускай сталіцы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Вядомаму неўролагу, выпускніку МДУ **М. І. Грашчанкаву** (1901—1965) належыць шэраг капітальных прац па фізіялогіі і паталогіі органаў пачуццяў, электрафізіялогіі, траўматычных і інфекцыйных захворваннях цэнтральнай нервовай сістэмы. Арганізатар навуковай работы ў сістэме савецкай аховы здароўя, М. І. Грашчанкаў унёс значны ўклад у развіццё навуковых даследаванняў у Беларусі. Ён — заснавальнік нейрахірургічнага цэнтра Інстытута неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі Міністэрства аховы здароўя БССР, узначальваў Інстытут эксперыментальнай медыцыны АН БССР. Член-карэспандэнт АН СССР, акадэмік АН Беларусі і АМН СССР, у 1947—1951 гг. — прэзідэнт Акадэміі навук БССР. Імя яго прысвоена лабараторыі праблем кіравання функцыямі арганізма чалавека і жывёл АН СССР, у памяць аб ім у нейрахірургічным аддзяленні БелНДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Прафесар, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР **М. В. Дарашэвіч** (1900—1968) шмат зрабіў для арганізацыі вышэйшай школы рэспублікі. Быў загадчыкам кафедры, затым рэктарам Беларускага політэхнічнага інстытута. З 1959 г. — міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Яго імем названа вуліца ў Мінску, на галоўным корпусе БПІ ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Імя правадзейнага члена Акадэміі мастацтваў СССР, народнага архітэктара СССР, заслужанага будаўніка БССР **У. А. Караля** (1912—1980) назаўсёды ўпісана ў гісторыю беларускай сталіцы. Па яго праектах узведзены будынкі Галоўнага паштамта і Галоўнага тэлеграфа, ён удзельнічаў у распрацоўцы праекта і забудове Ленінскага праспекта, плошчаў Перамогі і Цэнтральнай (цяпер Кастрычніцкай). Створаны сумесна з архітэктарам Г. Заборскім, скульптарамі А. Бембелем, А. Глебавым і С. Селіханавым манумент Перамогі стаў упрыгожаннем горада. Ён — адзін з аўтараў мемарыяльнага комплексу, прысвечанага абаронцам Брэсцкай цытадэлі. Напісаў шмат работ па архітэктуры і горадабудаўніцтву, больш як 24 гады ўзначальваў Дзяржаўны камітэт БССР па справах будаўніцтва, быў загадчыкам кафедры горадабудаўніцтва БПІ.

У Мінску на вуліцы, названай імем У. А. Караля, і на доме па вуліцы Захарава, дзе ён жыў, устаноўлены мемарыяльныя дошкі, яго імя прысвоена сярэдняй школе № 1 у г. Чэрвені.

Герой Сацыялістычнай Працы, член-карэспандэнт АН СССР, акадэмік АН БССР **В. Ф. Купрэвіч** (1897—1969) унёс значны ўклад у развіццё беларускай савецкай навукі. Сялянскі сын, балтыйскі марак, актыўны ўдзель-

нік Вялікага Кастрычніка, ён на працягу 17 гадоў узначальваў Акадэмію навук рэспублікі, якая стала буйнейшай навуковай установай, атрымала ўсесаюзнае і міжнароднае прызнанне.

Вучоны распрацаваў пытанні, звязаныя з фізіялогіяй хворых раслін, паклаў пачатак новаму кірунку ў вывучэнні глебы—глебавай энзімалогіі. Яго імем названы Інстытут эксперыментальнай батанікі АН БССР, сярэдняя школа № 1 у Смалявічах, а таксама новыя формы кветкавых раслін з паўднёвых схілаў Гісарскага хрыбта. Па бязмежных марскіх прасторах плавае судна «Васіль Купрэвіч».

Вядомы савецкі вучоны, заслужаны дзеяч навукі БССР. акадэмік АН БССР **І. С. Лупіновіч** (1900—1968) плённа працаваў над праблемамі прыродна-гістарычнага раяніравання тэрыторыі СССР для сельскагаспадарчага выкарыстання. Шмат прац прысвяціў комплекснаму выкарыстанню Палескай нізіны і асваенню асушаных балот, павышэнню іх урадлівасці. У 1957—1961 гг. быў прэзідэнтам Сельскагаспадарчай акадэміі, загадчыкам кафедры глебазнаўства БДУ. Яго імя прысвоена Беларускай рэспубліканскай навуковай сельскагаспадарчай бібліятэцы Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР, на будынку БелНДІ глебазнаўства і аграхіміі ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

У плеяду выдатных вучоных, якія заклалі фундамент сучаснай тэарэтычнай і практычнай цеплафізікі, уваходзіць і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, акадэмік АН БССР, прафесар **А. В. Лыкаў** (1910—1974). Арганізатар і з 1956 г. нязменны дырэктар Інстытута цепла- і масаабмену АН БССР, загадчык кафедры цеплафізікі БДУ, ён апублікаваў 18 манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, 250 навуковых артыкулаў. Большасць з іх перакладзены і выдадзены ў ЗША, Англіі, Францыі, Германіі, Венгрыі і іншых краінах.

Аляксей Васільевіч адзін са стваральнікаў Міжнароднага цэнтра акадэмій навук сацыялістычных краін для павышэння кваліфікацыі навуковых кадраў у галіне цепла- і масапераносу, які працуе пры АН БССР. Быў рэдактарам ад СССР міжнароднага часопіса «Цепла- і масаперанос», сустаршынёй рэдакцыі ад СССР амерыканскага часопіса «Цеплаперанос, работы савецкіх вучоных». Істотны ўклад вучонага ў распрацоўку фундаментальных праблем фізікі адзначаны прэміяй Прэзідыума



В. Ф. Купрэвіч.



М. Ц. Лынькоў.



І. С. Лупіновіч.



У. І. Пічэта.



А. В. Лыкаў.



С. А. Умрэйка.

АН СССР імя І. І. Палзунова, залатымі медалямі шэрагу зарубежных краін.

Імя А. В. Лыкава прысвоена заснаванаму ім інстытуту, на будынку якога ёсць мемарыяльная дошка. У Інстытуце створаны мемарыяльны куток, дзе экспануюцца яго асабістыя рэчы, фатаграфіі, дакументы.

Народны пісьменнік Беларусі, акадэмік АН БССР **М. Ц. Лынькоў** (1899—1975) удзельнічаў у грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнах. У 1944—1946 і 1949—1952 гг. быў дырэктарам Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР. Выбіраўся кандыдатам у члены ЦВК БССР, у члены ЦК КПБ, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Яго раман-эпапея «Векапомныя дні» адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа.

Імя пісьменніка-вучонага носяць гомельскае ГПТВ № 35 і Крынкаўская сярэдняя школа Лёзненскага раёна на Віцебшчыне, вуліцы ў Мінску і Бабруйску. У беларускай сталіцы на доме па Ленінскаму праспекту, дзе ён жыў, ёсць мемарыяльная дошка. Па стальных магістралях рэспублікі імчыць цеплавоз «Міхась Лынькоў». Так названы і цеплаход, які рэжа дняпроўскія хвалі.

Даследчык, акадэмік АН СССР і АН БССР **У. І. Пічэта** (1878—1947) быў выдатным арганізатарам гістарычнай навукі ў Савецкім Саюзе. З яго імем звязана станаўленне беларускай савецкай гістарычнай школы, кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян у МДУ, пачатак работы сучаснага Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР. Велізарная роля яго ў стварэнні БДУ, развіцці даследаванняў у АН БССР, дзе ён быў выбраны ў ліку першых яе акадэмікаў. 9 гадоў кіруючы універсітэтам, вучоны праявіў талент педагога, грамадскага дзеяча, далучыў да работы ў ім вядомых вучоных, кваліфікаваныя кадры. Не раз выбіраўся членам ЦВК БССР.

Пяру даследчыка належыць больш як 500 друкаваных прац.

Калектыў БДУ захоўвае памяць аб выдатным савецкім вучоным. Пачынаючы са 100-годдзя з дня яго нараджэння, тут рэгулярна праводзяцца «пічэтаўскія чытанні», адной з аўдыторый прысвоена яго імя, яго жыццю і дзейнасці прысвечана адна зала універсітэцкага музея, у вестыбюлі гістарычнага факультэта ўстаноўлены бюст У. І. Пічэты. На заснаванай ім першай у СССР кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян МДУ ёсць мемарыяльная дошка.

Адзначаны заслугі і іншых вучоных. Так, імя члена-карэспандэнта АПН СССР, заслужанага настаўніка БССР, прафесара С. А. Умрэйкі носіць Пясачанская сярэдняя школа Капыльскага раёна на Міншчыне, імя заслужанага дзеяча навукі БССР, члена-карэспандэнта АМН СССР З. К. Магілеўчыка прысвоена вуліцы ў г. п. Бялынічы і ўчастковай бальніцы ў пасёлку Галаўчын. Пры НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ адкрыты мемарыяльны музей у гонар яго заснавальнікаў акадэмікаў АН БССР Л. В. Валадзько і А. Н. Сеўчанкі. Пакой-музей акадэміка АН БССР П. Ф. Ракіцкага створаны на Палескай біялагічнай станцыі ў пасёлку Крынічнае Мазырскага раёна.

Аднак у гэтым кірунку зроблена яшчэ далёка не ўсё.

**Г. КАРЗЕНКА,**
**кандыдат гістарычных навук.**

# КРЭЎСКАЯ УНІЯ

У ЗАМКУ Крэва (цяпер пасёлак у Смаргонскім раёне) у 1385 годзе, 600 гадоў назад, адбылося пагадненне паміж паслáмі Польшчы і князем Віцебскім, Крэўскім і вялікім князем Літоўскім Якавам Андрэевічам—у літаратуры больш вядомым пад язычніцкім імем Ягайлы—аб яго жаніцьбе на польскай каралеве Ядвізе і саюзе (уніі) дзвюх дзяржаў пад верхавенствам аднаго гасудара. Гэты саюз унёс карэнныя змены ў палітыку абедзвюх дзяржаў. Уся гісторыя народаў Беларусі, Літвы, Украіны і Польшчы на працягу 400 гадоў знаходзілася пад уздзеяннем гэтага саюза. Асабліва карысны ён быў для Польшчы, бо менавіта дзякуючы уніі яна была выратавана ад поўнага анямечвання, якое ў XIV ст. было такім моцным, што пры каралеўскім двары і нават ва ўсіх буйных гарадах нямецкая мова і права сталі дзяржаўнымі. Нямецкае засілле асабліва ўзрасло пры Казіміры III, які ў 1335 г. уступіў немцам Сілезію, а ў 1343 г. аддаў крыжаносцам польскае памор'е і шэраг іншых зямель. Пераемнікам Казіміра III быў венгерскі кароль Людовік з дома Анжу, які сам удзельнічаў у разбойніцкіх паходах крыжаносцаў на Беларусь і Літву. Ён жа ў 1380 г. назначыў правіцелем Польшчы немца (мужа сваёй дачкі) Сігізмунда Люксембургскага, які з 1411 г. стаў імператарам Свяшчэннай рымскай імперыі, а малодшую дачку заручыў з Вільгельмам Габзбургам Аўстрыйскім.

Каб канчаткова не трапіць у рукі немцаў, польскія феадалы пад уздзеяннем народа вымушаны былі пайсці на разрыў дагавора з Вільгельмам Аўстрыйскім і вырашылі пачаць перагаворы з вялікім князем Літоўскім Ягайлам аб яго жаніцьбе на Ядвізе і аб саюзе дзвюх дзяржаў.

Саюз паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай быў выгадны абедзвюм дзяржавам і ўсім народам Усходняй Еўропы, бо дазваляў аб'ядноўваць сілы для сумеснага адбіцця нямецкай агрэсіі, а таксама для развіцця прадукцыйных сіл, для ўстанаўлення трывалых гандлёвых сувязей.

Умовы Крэўскага пагаднення дакладна невядомы. Гаворыцца толькі пра абяцанні, якія, быццам, Ягайла даў польскім прадстаўнікам, але запіс гэтых абяцанняў, відаць, падложны і па большасці пунктаў не выконваўся, акрамя хрышчэння насельніцтва Беларусі і Літвы ў каталіцкую веру. Феадалы Вялікага княства Літоўскага не раз выступалі супраць падману польскіх хранікёраў, у 1559 г. нават было паднята